13

БИБЛИОТЕКА

www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

24 лютага 2009 года, № 3 (1996)

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# МОСТ НА ВОСТРАЎ СВАБОДЫ



Рэктары БДУ і Гаванскага універсітэта Сяргей Абламейка і Рубен Сардоя Лаўрэда замацоўваюць падпісанае пагадненне

***Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж вядучымі ВНУ нашай краіны і Кубы — Беларускім дзяржаўным і Гаванскім універсітэтамі — быў падпісаны падчас візіту рэктара БДУ прафесара Сяргея Абламейкі на Кубу з 8 па 14 лютага.***

Гаванскі універсітэт, таксама як і наш, адносіцца да тыпу класічных вышэйшых навучальных устаноў і культывуе ўсе кірункі навукі. Найстарэйшая кубінская ВНУ мае 280-гадовую гісторыю, а сёння ў ёй навучаецца каля 30 тыс. студэнтаў, з іх 2 тыс. – замежнікі. Магчыма, ужо сёлета дэлегацыя Гаванскага універсітэта наведае БДУ ў адказ.

Акрамя таго, кіраўнік Белдзяржуніверсітэта прыняў удзел у працы XIII Міжнароднага сімпозіума “Інфарматыка-2009”, у рамках якога ён выступіў з дакладамі на дзвюх канферэнцыях: “Геаматыка”, а таксама “Інфарматыка і ахова здароўя”. Усяго гэтае мерапрыемства прыцягнула больш за 2 тыс. навукоўцаў са шматлікіх краін свету. У павільёне PABEXPO была арганізавана выстава “Новыя тэхналогіі: развіццё і суверэнітэт”.

Сяргей Абламейка правёў перамовы ў Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі, на якіх гаворка ішла пра распрацоўкі навукоўцаў БДУ і НАН Беларусі ў сферы касмічных і інфармацыйных тэхналогій, і абмеркаваў перспектывы супрацоўніцтва ў галіне хіміі з кіраўніцтвам Цэнтра навуковых даследаванняў Кубы. Адбылася таксама сустрэча з дарадцам Дзяржсавета Кубінскай рэспублікі Фідэлем Кастра Дыясам, які наведаў БДУ ў верасні мінулага года, і шэраг іншых сустрэч, у тым ліку і з нашымі венесуэльскімі партнёрамі.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі паездкі і суправаджэння рэктара БДУ аказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь на Кубе Уладзімір Астапенка, дарэчы, былы прарэктар нашага універсітэта па міжнародных сувязях.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

## ВІНШУЕМ!

***14 супрацоўнікаў нашага універсітэта — удзельнікаў ваенных дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў узнагароджаны 16 лютага на Вучоным савеце БДУ юбілейным медалём “20 гадоў вываду савецкіх войскаў з Афганістана”.***

***А 23 лютага ў Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны воінаў-інтэрнацыялістаў, ветэранаў ВАВ, а таксама ўсіх былых ваеннаслужачых з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь павіншаваў першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў***



## СПАБОРНІЦТВЫ

# ВЯЛІКІЯ СПАДЗЯВАННІ

***Беларускія студэнты-спартсмены з 14 па 28 лютага прымаюць удзел у XXIV Сусветнай зімовай універсіядзе ў Харбіне (КНР). 13 лютага ў Белдзяржуніверсітэце адбыліся іх урачыстыя праводзіны.***

Удзел у цырымоніі прынялі міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр Радзькоў, міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў, а таксама першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў.

Усяго на універсіядзе прадстаўлена 50 нацыянальных федэрацый студэнцкага спорту з усіх кантынентаў планеты. Больш за 2 тыс. спартсменаў разыграюць медалі ў 12 відах спорту.

Беларускія студэнты з васьмі ВНУ прымуць удзел у 6 відах: біятлоне, канькабежным спорце, лыжных гонках, фігурным катанні, фрыстайле, шорт-трэку.

У склад беларускай каманды ўвайшлі 34 спартсмены, а таксама трэнеры, суддзі і дактары. Найбольшае прадстаўніцтва ў зборнай камандзе мае БДУФК – 17 студэнтаў. 5 студэнтаў прадстаўляюць Віцебскі дзяржуніверсітэт ім. П. Машэрава. Белдзяржуніверсітэт дэлегаваў 4 маладых атлетаў: студэнтаў гістарычнага факультэта Сяргея Дашкевіча (біятлон), Аляксандра Іяненкава, Валянціну Камінскую (абодва – лыжныя гонкі), а таксама студэнтку ФФСН Марыю Старавойтаву (лыжныя гонкі). Акрамя таго, загадчык кафедры фізвыхавання і спорту БДУ Віктар Каляда прызначаны намеснікам главы беларускай дэлегацыі.

По словах Аляксандра Грыгарава, з 1993 г. беларускія спартсмены з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі Сусветных універсіяд і годна прадстаўляюць краіну. На зімовых і летніх універсіядах заваявана 129 медалёў, з іх 33 залатыя, 47 срэбраных і 49 бронзавых.

На універсіядзе ў студзені 2007 г. у Турыне (Італія) зборная каманда Беларусі была прадстаўлена 39 спартсменамі з 7 ВНУ ў 7 відах спорту. Нашы студэнты заваявалі 8 залатых, 2 срэбраныя і 4 бронзавыя медалі, што дазволіла ім у неафіцыйным заліку заняць 4-е каманднае месца.

Студэнты БДУ традыцыйна ўносяць істотны ўклад у агульны поспех нацыянальнай зборнай.



Спартсмены БДУ разам з міністрамі краіны і афіцыйнымі асобамі універсітэта

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**І Ў ДРУЖБУ І Ў СЛУЖБУ**

Як вядзецца ўлік ваеннаабавязаных у БДУ і запіс на курсы малодшых афіцэраў на ваенным факультэце

**Стар. 2**

**БОЛЬШ ГРОШАЙ І ГАРАНТЫЙ**

Пра захады прафсаюзаў па паляпшэнні праваога і сацыяльнага стану аспірантаў, дактарантаў і маладых выкладчыкаў

**Стар. 3**

**УНІВЕРСІТЭТ — ТВОЙ КРОК У БУДУЧЫНЮ!**

Актывісты БРСМ БДУ зладзілі грамадска-асветніцкую акцыю для абітурыентаў Лідчыны

**Стар. 4**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПЛАН па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 90-годдзя Бедзяржуніверсітэта зацверджаны рэктарам БДУ Сяргеем Абламейкам, які ўзначаліў юбілейны аргкамітэт. За тры гады мяркуецца ажыццявіць 450 розных мерапрыемстваў.

ПЕРШЫ прарэктар Міхаіл Жураўкоў 20 лютага выступіў з дакладам “Стан навукі і інавацыйнай дзейнасці ў БДУ” на агульным сходзе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

ДЫРЭКТАР Цэнтра еўрапейскіх рэформаў Чарльз Грант 17 лютага выступіў перад студэнтамі факультэта міжнародных адносін БДУ. Цэнтр еўрапейскіх рэформаў – недзяржаўная арганізацыя, заснаваная ў 1996 г., – з’яўляецца вядучай “фабрыкай думкі” Вялікабрытаніі, якая займаецца еўрапейскай праблематыкай.

ДЭЛЕГАЦЫЯ ПАСЕ на чале са старшынёй камісіі па палітычных пытаннях Ёранам Ліндбладам у межах свайго візіту ў Беларусь 18 лютага сустрэлася з кіраўніцтвам БДУ, выкладчыкамі і студэнтамі ВНУ ў вучэбным корпусе па вул. Кальварыйская, 9.

БДУ возьме ўдзел у 7-й спецыялізаванай выставе “Адукацыя і кар’ера–2009”. Яна пройдзе з 26 па 28 лютага ў сталічным Палацы моладзі. Нашы спецыялісты правядуць семінары для абітурыентаў і іх бацькоў. На семінарах выступяць прадстаўнікі ўсіх факультэтаў БДУ, якія раскажуць пра адпаведныя спецыяльнасці.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# І Ў ДРУЖБУ І Ў СЛУЖБУ



*Сяргей Радзівонаў праводзіць інструктаж з кіраўнікамі УВРМ наконт уліку першакурснікаў*

***Як мінімум у палове анекдотаў пра студэнтаў так або інакш фігуруе армія. Сапраўды, большасць такіх хлопцаў усё яшчэ трапляюць пад прызыў, а значыць, знаходзяцца пад пільным вокам узброеных сіл.***

У адміністрацыйным будынку БДУ на Бабруйскай, 7 знаходзіцца загадкавы 2-гі аддзел (ваенны стол). Менавіта ён і займаецца сувязямі паміж ваенкаматамі і універсітэтам, а таксама іншымі пытаннямі мабілізацыйнай гатоўнасці. Яго начальнік Сяргей РАДЗІВОНАЎ пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў, якія могуць цікавіць як студэнтаў, так і тых, хто толькі рыхтуецца імі стаць.

### Медкамісія, маршы і міліцыя

Наогул, яшчэ ў прыёмнай камісіі абітурыент можа даведацца, што яму рабіць, каб выпадкова не атрымаць позву ў ваенкамат у разгар сесіі. Уся інфармацыя – ад неабходных дакументаў да нумара патрэбнага кабінета – у членаў камісіі маецца. Акрамя таго, сёлета першакурснікам раздавалі спецыяльныя памяткі. Тых жа, хто з нейкіх прычын не змог своечасова зарэгістравацца ў ваенным стале або проста забыў, 2-гі аддзел можа выклікаць праз факультэт.

"Зараз усё ідзе да таго, каб максімальна спрасціць бюракратычныя працэдуры. Праўда, і адказнасць прызыўніка таксама павінна быць вышэйшай, – гаворыць Сяргей Міхайлавіч. – У нас нават не прынцып "аднаго акна", а прынцып "адной фортачкі". У адпаведнасці з гэтым прынцыпам, студэнты, якія рэгіструюцца ў ваенным стале БДУ, павінны ўсяго толькі запоўніць невялікую анкету. Нават палову анкеты. Усім астатнім займаюцца супрацоўнікі аддзела.

Змянілася сёлета сітуацыя з адтэрміноўкамі. Не хвалюйцеся, усе, хто паступае ў ВНУ, будуць спакойна вучыцца да самага выпуску. Аднак, калі студэнта адлічылі, усё залежыць ад таго, за што. Калі прычына адлічэння – непаспяховасць або недысцыплінаванасць, то ад службы ў арміі ўжо не ўцячы, нават калі аднавіцца. Аднак фармулёўка "па ўласным жаданні" або "ў сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам" дазваляе разам з вучобай аднавіць і адтэрміноўку.

Распавёў Сяргей Радзівонаў і пра працу з ваенкаматамі. У прыватнасці, ён абверг меркаванне, быццам урачы ў медкамісіях пішуць "прыгодны" ўсім запар. На яго словах, больш за 90% прызыўнікоў праходзяць медкамісію ў паліклініках у грамадзянскіх дактароў. А яны зусім не зацікаўленыя ў тым, каб адправіць служыць непрыдатнага чалавека. Таму што, калі яго хвароба выявіцца ўжо ў шпіталі, урачу гэта будзе залічана як недагляд. Вынік – як мінімум пазбаўленне прэміі. Натуральна, нікому лішнія праблемы не патрэбныя, таму ў спрэчным выпадку доктар хутчэй вынесе рашэнне "непрыгодны".

Сяргей Міхайлавіч лічыць, што зараз служыць у арміі нашмат лягчэй, чым, напрыклад, у СССР. Па-першае, накіроўваюць нававбранцаў у часткі найболей блізкія да дома (выключаючы памежнікаў). Па-другое, у выпускнікоў ВНУ ёсць права праходзіць службу ў рэзерве. Сутнасць такая: на працягу двух гадоў чалавек абавязаны ездзіць на ваенныя зборы. У канцы такой службы ён здае іспыт на ваенную спецыяльнасць і атрымлівае ваенны білет. Па-трэцяе, ужо пасля медкамісіі сучасны прызыўнік ведае, у якое падраздзяленне яго накіруюць. Аж да роты і батальёна. Можна загадзя наведаць будучае месца службы і пачаць наладжваць кантакты з будучым начальствам.

Цікава, што калі ў студэнта раптам з'явіцца жаданне пайсці служыць (па словах Сяргея Міхайлавіча, здараецца і такое), проста так яго не прызавуць. Спачатку трэба напісаць абгрунтаванне. А ўжо потым камісія вынесе рашэнне.

Калі ж прызыўнік настолькі не хоча служыць, што ўсімі праўдамі і няпраўдамі імкнецца пазбегнуць прызыву, у Крымінальным кодэксе ёсць артыкул № 435, па якім прадугледжана пакаранне – ад штрафу да 5 гадоў пазбаўлення волі. І служыць прыйдзецца ўжо пасля выхаду з турмы. Па словах начальніка 2-га аддзела, двойчы ў год актыў універсітэта прысутнічае на працэсах супраць "ухілістаў", дзе студэнты могуць самі паглядзець на магчымыя наступствы "адкосу".

Больш падрабязна ўсё, што звязана з тэрміновай ваеннай службай, апісана на сайце Міністэрства абароны – *www.mod.mil.by*. Там можна задаць любое пытанне on-line і атрымаць адказ спецыяліста. Або проста пагутарыць на форуме на тэму зброі, тэхнікі і нават авіясімулятараў.

### У афіцэры я б пайшоў...

У студэнтаў БДУ ёсць магчымасць акрамя грамадзянскай спецыяльнасці атрымаць яшчэ і ваенную. Як вы, напэўна, здагадаліся, гаворка ідзе пра праграму падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і афіцэраў запасу, у народзе – "ваенную кафедру". Парадак прыёму вызначаецца палажэннем, якое прымаецца кожны год у канцы лютага – пачатку сакавіка. Сёлета кардынальных змен не прадбачыцца, хутчэй за ўсё, правілы застануцца тыя ж.

Каб паступіць на курсы падрыхтоўкі малодшых камандзіраў, трэба перш зірнуць на сябе. Калі вы – другакурснік, вучыцеся на вочным, вам ад 18 да 27 гадоў, вы прыдатныя да службы (ГО-1, ГО-2, ГО-3) і яшчэ не служылі, можна пачынаць збіраць дакументы. Неабходна напісаць заяву на імя рэктара, прайсці медкамісію (папярэдне ўзяўшы накіраванне) і атрымаць даведку, узяць прыпіснае пасведчанне, пашпарт, залікоўку і прынесці гэта ўсё на ваенны факультэт. Далей усё будзе залежаць ад вашай паспяховасці. Адбор праводзіцца па выніках першых трох сесій, а таксама па выніках медкамісіі. Адвучыўшыся год на курсах па падрыхтоўцы малодшых камандзіраў, вы атрымаеце званне сяржанта і будзеце служыць паўгода.

***Ідуць два салдаты па казарме. Адзін кажа другому:***
***- Давай, Васіль, са старшыны прыкалынёмся?***
***- Ды ну цябе, Мікола, з дэкана ўжо пажартавалі!***



*Са зброяй сябруем, характар свой гартуем*

На курсы падрыхтоўкі афіцэраў запасу прымаюць трэцякурснікаў, якія паспяхова здалі іспыты па праграме падрыхтоўкі малодшых камандзіраў, а таксама студэнтаў, якія ўжо прайшлі тэрміновую службу. На некаторыя спецыяльнасці гэтай праграмы прымаюць і дзяўчат, але толькі з дазволу міністра абароны. Дакументы патрэбныя тыя ж. Толькі крытэрыі адбору трохі змяняюцца. Тыя, хто лепш здаў іспыты па праграме падрыхтоўкі малодшых камандзіраў, маюць больш шанцаў паступіць. Тыя, хто скончыў навучанне па гэтай праграме, становяцца лейтэнантамі запасу. Тэрміновую службу яны не праходзяць.

**Аляксандр КРАСЬКО**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

ВЫСТАВЫ

# КНІЖНЫ РАЙ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

***РУП "Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта" атрымала дыплом за актыўны ўдзел у XVI Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы "Кнігі Беларусі-2009", якая праходзіла ў Нацыянальным выставачным цэнтры "БелЭкспа" з 11 па 15 лютага.***

Выдавецтва пастаралася паказаць усе свае навінкі – выданні, што ўбачылі свет у мінулым годзе. А ён быў вельмі плённым: было выпушчана 210 выданняў агульным тыражом больш за 47 тыс. экзэмпляраў. Прычым іх падрыхтоўку да друку выдавецкі цэнтр ажыццяўляў уласнымі сіламі. Да ўсяго, надрукавана вялікая колькасць кніг упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы нашага універсітэта. Экспазіцыя складалася з двух частак. Адна з іх давала ўяўленне наведвальнікам выставы пра выдавецкую дзейнасць РУП, а другая – пра паліграфічную.

"Калі скласці ўсе кнігі, якія выходзяць з нашай тыпаграфіі, падрыхтаваныя як намі ўласна, так і УРВР, то Белдзяржуніверсітэт трапляе ў лідары па вытворчасці кніжнай прадукцыі", – гаворыць Андрэй Карпіловіч, дырэктар РУП. Па яго словах, нягледзячы на наяўнасць такога буйнога выдавецтва, як "Вышэйшая школа", "Выдавецкі цэнтр БДУ" здолеў заняць сваю нішу і лічыцца цяпер адным з найлепшых кнігавыдаўцоў у галіне гуманітарных навук. "Паняцце якасці – гэта паняцце выдавецкага сумлення, – дадае Андрэй Аляксандравіч. – Усе вучэбныя дапаможнікі, за якія мы бяромся, ідуць пад грыфам Міністэрства адукацыі Беларусі, а значыць, адпавядаюць тыпавым вучэбным праграмам. Гэта для нас важна, бо мы імкнёмся забяспечыць вучэбны працэс не толькі БДУ, але і іншых ВНУ краіны. Актыўна супрацоўнічаем з вышэйшымі навучальнымі установамі Брэста, Магілёва, Віцебска і інш.".



*Супрацоўнікі "Выдавецкага цэнтра БДУ" разам з намеснікам міністра інфармацыі Беларусі Ігарам Лапцёнкам*

Выстава-кірмаш, у якой РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" удзельнічае кожны год, дае магчымасць хутчэй знайсці спажыўца на прадукцыю. Асаблівыя спадзяванні працаўнікі друку ўскладаюць на Дзень бібліятэк і Дзень ведаў, якія зазвычай праходзяць у межах выставы. Каб яшчэ больш прыцягнуць увагу, сёлета была зладжана прэзентацыя вучэбнага дапаможніка "Гісторыя сярэдніх вякоў" пад рэдакцыяй Віктара Фядосіка і Ігара Еўтухова. "Гэта новае сучаснае выданне ў трох тамах. Яно будзе карыстацца вялікім попытам не толькі ў студэнтаў, але ва ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй", – упэўнена галоўны рэдактар выдавецтва Таццяна Янчук.

**Ганна ЛАГУН**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

**На гістарычным факультэце 12 лютага адбыўся круглы стол на тэму "Афганістан – 20 гадоў вываду савецкіх войскаў. Вынікі і ўрокі".**

Да гутаркі далучыліся былыя студэнты БГУ, якія бралі ўдзел у баявых дзеяннях, прадстаўнікі Савета ветэранаў Белдзяржуніверсітэта, навукоўцы і выкладчыкі, а таксама цяперашнія студэнты. Выступілі спецыялісты Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны, з фондаў якога была зладжана выстава баявой зброі і рыштунку вайскоўцаў Савецкай Арміі.

***

**Першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Рэлігіязнаўства на постсавецкай прасторы" адбылася 21 лютага ў Інстытуце тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірылы.**

У канферэнцыі бралі ўдзел вядомыя і маладыя навукоўцы з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы. У рамках пленарнага пасяджэння прайшла прэзэнтацыя Інстытута тэалогіі, які разам з кафедрай філасофіі культуры ФФСН БДУ, а таксама Моладзевай асацыяцыяй рэлігіязнаўцаў (г. Кіеў) выступіў арганізатарам канферэнцыі.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся першы прарэктар Інстытута тэалогіі, кандыдат багаслоўя, епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім.

На канферэнцыі прагучалі даклады, прысвечаныя аналізу асноўных тэндэнцый развіцця рэлігіязнаўства ў згаданых краінах.

У ПРАФКАМЕ

# БОЛЬШ ГРОШАЙ І ГАРАНТЫЙ

## аспірантам, дактарантам, маладым выкладчыкам

***Прававы статус і сацыяльная абарона аспірантаў, дактарантаў і маладых выкладчыкаў ВНУ сталі асноўнымі тэмамі круглага стала, зладжанага ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі сумесна з Міністэрствам адукацыі краіны.***

9 лютага прадстаўнікі ўплывовых прафсаюзаў краіны абменьваліся меркаваннямі пра тое, як палепшыць матэрыяльны стан і падтрымаць даследчыцкі імпэт маладых навукоўцаў, а таксама адказвалі на іх пытанні і выслухвалі прапановы.

Сярод шырокага кола ўзнятых пытанняў прыцягваюць увагу змены ў нарматыўнай базе, прапанаваныя ВАК для паляпшэння прававога і сацыяльнага статусу навукоўцаў. 9 прававых актаў з ініцыятывы ВАК праходзяць апошні віток ўзгаднення ў зацікаўленых міністэрствах і ведамствах. У адпаведнасці з новым палажэннем пра падрыхтоўку навуковых кадраў, якое мае быць зацверджаным прэзідэнцкім указам, уводзіцца **навуковая кваліфікацыя даследчыка.**

Дасюль выпуск з аспірантуры часта азначае, што выпускнік атрымлівае пасведчанне пра здачу кандыдацкіх іспытаў і адпраўляецца працаваць за грошы меншыя, чым была стыпендыя, што вымушае яго прамяняць навуковыя пошукі на пошукі "прыстойнай" працы, пры гэтым яго кваліфікацыя, адукацыйны і інтэлектуальны ўзровень, павышаныя з дапамогаю аспірантуры, не ацэньваюцца працадаўцам у грашовым эквіваленце. Навашвядзенне мае на мэце выправіць сітуацыю: па заканчэнні аспірантуры выпускніка будзе чакаць дзяржаўная камісія, якая ацэніць, наколькі паспяхова ён прайшоў навучанне і ці мае ягоная дысертацыя шанец быць абароненай, затым выдасць дыплом даследчыка, які забяспечыць дыпламанту даплату да заробку ў памеры 1 тарыфнай стаўкі 1 разраду. Прыгадаем, што, паводле Указа № 450 "Аб устанаўленні даплат за навуковыя ступені і званні" ад 1 студзеня 2008 года, 2 стаўкі 1 разраду атрымліваюць кандыдаты навук, не задзейнічаныя ў ВНУ. Дыпламаваны даследчык атрымае яшчэ адзін прывілей – права займаць пасаду старшага навуковага супрацоўніка (для чаго зараз прэтэндэнту без навуковай ступені патрэбны стаж мінімум 10 гадоў).

Даплаты за навуковыя ступені і званні пакліканыя стымуляваць інтэлектуальна-творчую працу, падняць яе прэстыж і павялічыць навукова-педагагічны патэнцыял краіны. Каб мець добрыя навуковыя кадры, трэба напачатку абзавесціся тымі, хто гэтыя кадры будзе рыхтаваць. **Навуковае кіраўніцтва** істотнае для паспяховасці аспіранта – таму ў новым палажэнні мяркуецца павялічыць колькасць гадзін на навуковае кіраўніцтва аспірантамі, суіскальнікамі, а таксама на кансультаванне дактарантаў, з 50 да 100 у год.



*Старшыня прафкама студэнтаў БДУ Ніна Радзевіч – зацікаўлены ўдзельнік круглага стала*

Двухгадовае суіскальніцтва, якое існавала да 2004 г., будзе аднаўлена, што зручна для, прыкладам, супрацоўніка НДІ, які паралельна з асноўнай працай праводзіць даследаванне, якое становіцца амаль гатовай дысертацыяй – яго не мае сэнсу тры гады трымаць на маналой дзяржаўнай стыпендыі, а можна даць толькі 2 гады на падрыхтоўку да здачы кандыдацкага мінімуму.

Для павышэння якасці дысертацый будзе ўведзены конкурс на званне **"Лаўрэат года"**: аўтар найлепшай кандыдацкай або доктарскай дысертацыі (па адной з намінацый – гуманітарныя навукі, прыродазнаўчыя навукі, медыцынска-ветэрынарныя, тэхнічна-сельскагаспадарчыя) атрымае дыплом лаўрэата і будзе матэрыяльна падтрыманы разам са сваім навуковым кіраўніком.

Тэрмін навучання ў дактарантуры скарачаецца да 1 года.

На абмеркаванне заканадаўцаў вынесена пытанне, як дапамагчы маладым людзям, якія не паспелі абараніць дысертацыю ў тэрмін і адпраўляюцца ў войска (што часта ставіць крыж на кар'еры навукоўца), і як гарантаваць адпачынак аспірантам-завочнікам (студэнты-завочнікі, прыкладам, маюць па законе 60 дзён на абарону дыплома і 15 дзён на здачу залікаў), ці можна прызначыць выплаты па сацыяльным страхаванні (у памеры стыпендыі) аспіранту, які хварэе даўжэй за месяц.

Не абышлі ўвагаю і магістрантаў, якія першы семестр навучання атрымліваюць стыпендыю, роўную той, якую да першай сесіі маюць студэнты-першакурснікі (у сувязі з тым, што з 2008 г. магістратура прыроўненая да другой ступені вышэйшай адукацыі). Каб пазначыць розніцу паміж абітурыентамі і магістрантамі, апошнім прапануецца налічваць падвойную студэнцкую стыпендыю. Дарэчы, зараз парадак налічэння стыпендый прапісаны ў трох розных інструкцыях (асобныя для ВНУ, ПТВ, СНУ), што плануецца аб'яднаць у адным прававым акце – Пастанаўленні Савета Міністраў.

Пытанняў было шмат – пра ўразлівую праслойку навукоўцаў, якім ВАК не надаў навуковых ступеняў, пра прызнанне замежных навуковых ступеняў... Прэзідыум у складзе намесніка старшыні Федэральных прафсаюзаў Беларусі Андрэя Лук'яновіча, старшыні Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандра Бойкі, старшыні Беларускага прафсаюза супрацоўнікаў НАН Наталлі Аляксандравай, начальніка ўпраўлення навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі РБ Васіля Сафонава, галоўнага вучонага сакратара ВАК РБ Ніны Гулько нават дапамог вырашыць некалькі прыватных пытанняў, кшталту высвятлення правільнага месцазнаходжання працоўнай кніжкі адной з дактарантак.

Прыемна, калі не абмінаюцца ўвагаю нават дробязі. Бо менавіта з іх складаецца жыццё.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

**Фота аўтара**

## АБ'ЯВЫ

**ДУА "ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ" БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады**

ВЫКЛАДЧЫКА кафедры нацыянальнай культуры і турызму – 1.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, каб. 31, тэл.: 209-59-71.

**"РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ" БДУ**

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі ў сакавіку 2009 г.**

Асновы тэорыі і методыкі педагагічных вымярэнняў

*(для выкладчыкаў і спецыялістаў установ адукацыі)* ***02.03–13.03;***

Гісторыя і культура Беларусі: новыя падыходы да вывучэння

*(для выкладчыкаў і інш.)* ***16.03–27.03;***

Сацыялогія: стандарты новага пакалення, методыка выкладання

*(для выкладчыкаў)* ***16.03–27.03;***

Дэканат у сістэме менеджменту вышэйшай школы

*(для дэканаў, нам. дэканаў факультэтаў ВНУ)* ***23.03–27.03.***

Наш адрас: 220007, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, РІВШ, каб. 320, тэл.: 222-83-03, 200-20-47.

**ФАКУЛЬТЭТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ ЖУРНАЛІСЦКІХ КАДРАЎ ІНСТЫТУТА ЖУРНАЛІСТЫКІ БДУ**

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі ў сакавіку-красавіку 2009 г. :**

Асновы медыяэканомікі (фінансы і прэса)

*(для творчых работнікаў перыядычных выданняў, выкладчыкаў)* ***03.03-05.03*** *(24 гадзіны);*

Узаемадзеянне прэсы і дзяржаўных прэс-службаў у дэмакратычным грамадстве

*(для творчых работнікаў прэс-службаў і прэс-цэнтраў)* ***17.03-27.03*** *(78 гадзін);*

Беларускі правапіс: традыцыі, пераемнасць і перспектывы

*(для творчых работнікаў прэс-службаў, рэспубліканскіх выданняў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ)* ***20.03*** *(8 гадзін);*

Імідж сучаснага выдання

*(для творчых работнікаў рэгіянальных СМІ)* ***31.03-03.04*** *(36 гадзін);*

Рэдакцыйна-тэхнічная падрыхтоўка выданняў

*(для творчых работнікаў рэгіянальных СМІ, тэхнічных работнікаў тэлецэнтра, выкладчыкаў)* ***02.04*** *(6 гадзін);*

Сучасная фотажурналістыка: тэндэнцыі і перспектывы

*(для фотакарэспандэнтаў рэгіянальных СМІ)* ***14.04-24.04*** *(78 гадзін).*

Наш адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, ФПКЖК Інстытута журналістыкі БДУ, каб. 409, тэл.: 209-57-46.

НЕ ПРАМІНІЦЕ!

### Аб'яўляюцца конкурсы на суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі ў 2009 г.

У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку прысуджэння прэмій ім. У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі, зацверджаным загадам БДУ ад 30 студзеня 2009 г. № 38-ОД, аб'яўляецца конкурс на прысуджэнне прэміі імя У.І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук (адна праца), імя А.Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых навук (адна праца).

Прэміі прысуджаюцца за выбітныя дасягненні, якія ўключаюць:

– навуковыя працы па перспектыўных кірунках, якія ўносяць значны ўклад у развіццё адпаведнай галіны навукі і тэхнікі;

– стварэнне новай тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў;

– працы па зберажэнні рэсурсаў і энергіі, абароне навакольнага асяроддзя і рашэнні іншых важных для краіны задач;

– распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, якія істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў;

– стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і навучальнага абсталявання.

Дакументы падаюцца ў НДЧ-ГУН БДУ да 30 красавіка 2009 г. Падрыхтаваныя матэрыялы прымаюцца на адрас: вул. Бабруйская, 9, каб. 412 (аддзел суправаджэння і кантролю НДР) з 14 да 16 гадзін штодня. На конкурс падаюцца працы асобных аўтараў і калектыўныя працы, лік суаўтараў працы не можа быць большым за чатыры чалавекі.

Інфармацыю па конкурсе можна атрымаць у аддзеле суправаджэння і кантролю НДР (т. 209-51-62). Электронныя варыянты дакументаў размешчаны на серверы БДУ (Microsoft Outlook): "Агульныя папкі"/ "Усе агульныя папкі" / "Галоўнае ўпраўленне навукі" / "Конкурс А.Н. Сеўчанкі і У.І. Пічэты".

**НДЧ-ГУН БДУ**

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Гаванскім універсітэтам** – БелТА (17.02); stud.by (17.02); БелаПАН (18.02); univer.by (18.02); "Рэспубліка" (19.02).

**Міжнародная канферэнцыя "Рэлігіязнаўства на постсавецкай прасторы" ў Інстытуце тэалогіі БДУ** – БелТА (20.02).

**Жыццё падчас крызісу на прыкладзе студэнтаў БДУ** – "Комсомольская правда в Белоруссии" (20.02); open.by (20.02).

**Конкурс сачыненняў і рэфератаў сярод вучняў школ і ССНУ на тэму "Родимая земля, милее нет земли" Інстытута тэалогіі БДУ** – БелТА (19.02); "Советская Белоруссия" (19.02).

**Праект сучаснага студэнцкага мікраспадарожніка НДІ ПФП БДУ і НДІ ядзернай фізікі МДУ ім. Ламаносава**– БелТА (18.02).

**Фестываль адкрытай лігі КВЗ БДУ** – БелТА (17.02).

**Тыдзень роднай мовы на філалагічным факультэце БДУ** – БелТА (16.02).

**Дэкан факультэта міжнародных адносін Віктар Шадурскі разважае пра супрацоўніцтва Беларусі з еўрапейскімі краінамі** ("Мост в будущее") – "Народная газета" (13.02).

**Дэкан эканамічнага факультэта Міхаіл Кавалёў каментуе эканамічную сітуацыю ў нашай краіне** – bdg.by (11.02).

**Стварэнне лабараторыі па вывучэнні аперацыйных сістэм, якія свабодна распаўсюджваюцца, на ФПМІ** – БелТА (09.02); telegraf.by (09.02); tut.by (10.02).

**Тэатр "На балконе" філалагічнага факультэта БДУ ("Что наша жизнь? Игра")** – "Минский курьер" (06.02).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# РАЎНЕННЕ НА КАФЕДРУ!

**Кафедра фізвыхавання і спорту заняла першае месца ў спартакіядзе "Здароўе" сярод супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта.**

Другое месца – у фізічнага факультэта, трэцяе – у службы аховы. Узнагароджанне пераможцаў адбылося 7 лютага ў спартыўнааздараўленчым комплексе "Бругаціна" ў рамках "Дзён здароўя", якія адбыліся тут з 6 па 8 лютага.

Усяго ў спартакіядзе, арганізаванай прафкамам БДУ, прынялі ўдзел 20 камандаў, якія прадстаўляюць, акрамя пераможцаў, факультэты радыёфізікі і электронікі, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, механіка-матэматычны, журналістыкі, геаграфічны, міжнародных адносін, юрыдычны, хімічны, гістарычны, ваенны, а таксама ліцэй, юркаледж, Фундаментальную бібліятэку, навучальна-спартыўны комплекс, НДІ ПФП і ФХП, РІВШ. Спаборніцтвы праходзілі ў снежні 2008 г. і студзені 2009 г. па наступных відах спорту: армрэслінг, баскетбол, валейбол, міні-футбол, настольны тэніс, плаванне, шахматы, гіравы спорт.

Спартакіяда "Здароўе" арганізуецца прафсаюзным камітэтам і кафедрай фізвыхавання і спорту штогод у мэтах далучэння супрацоўнікаў БДУ да здаровага ладу жыцця, заняткаў спортам і фізічнай культурай, для выяўлення самых моцных спартсменаў і павышэння іх спартыўнага майстэрства, паспяховай падрыхтоўкі да спаборніцтваў раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню.

**Аляксандр КРАСЬКО**

ДОБРАЯ СПРАВА

# УНІВЕРСІТЭТ – ТВОЙ КРОК У БУДУЧЫНЮ!

***Праект "Універсітэт – твой крок у будучыню!" быў рэалізаваны 12 – 14 лютага ў школах г. Ліды і Лідскага раёна студэнтамі БРСМ БДУ. Добры настрой, студэнцкі крэатыў, здзіўленыя твары школьнікаў і педагогаў, запамінальныя дыскатэкі... Зрэшты, пра ўсё па парадку.***

Як сказаў нехта з вялікіх, усё геніяльнае – простае. Так здарылася і ў нашым выпадку. Зараз ніхто не прыгадае, калі менавіта нарадзілася ідэя грамадска-асветніцкай акцыі для абітурыентаў, але яна сур'ёзна "захапіла" актывістаў БРСМ БДУ. У якасці палігона была выбраная Лідчына, гарадскія і раённыя ўлады якой ахвотна пайшлі насустрач гэтай ініцыятыве. Пасля ўзгаднення з кіраўніцтвам ВНУ ўсё і пачалося...

Два месяцы напружанай працы і падрыхтоўкі, рэпетыцыі, прэзентацыі, сустрэчы з псіхалагічнай службай БДУ, агляды канцэртных нумароў і г.д. І вось ужо ўсе 8 камандаў-удзельніц – у будынку рэктарата. Паўсюль аб'ектывы камер, кіраўніцтва універсітэта, высокія госці. На тварах хлопцаў і дзяўчат бачна хваляванне, і гэта не дзіўна: для ўдзелу ў праекце адабраныя найлепшыя, і кожнаму хочацца апраўдаць усклдзеныя спадзяванні.



Старт акцыі даў першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў. Праводзілі ўдзельнікаў прарэктар БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Сувораў, прадстаўнік Міністэрства адукацыі В. Якжык, першы сакратар ЦК БРСМ Ю. Крывадубскі, сакратар ЦК БРСМ М. Борд, першы сакратар МГК БРСМ А. Хадыка.




Рапарты аб гатоўнасці здадзены, каманды гатовыя... Наперад!

Некалькі гадзін язды – і жаданых гасцей ужо сардэчна сустракаюць у Лідскім райвыканкаме. Затым удзельнікі праекта ўскладаюць кветкі да помніка Францыску Скарыну і воінам-інтэрнацыяналістам і адпраўляюцца да школьнікаў з 24 школ Ліды і Лідскага раёна, якія іх з нецярпеннем чакаюць.

Студэнты БДУ "запалілі" сэрцы заўтрашніх абітурыентаў: прэзентацыі ВНУ і факультэтаў, трэнінгі па прафарыентацыі, практыкум па здачы іспытаў, спартыўныя турніры, гульня "Сутычка", творчыя вечары, дыскатэкі – усё гэта падрыхтавалі маладзевыя лідары для сваіх малодшых таварышаў. Хлопцы і дзяўчаты на ўласным прыкладзе паказалі, што вучоба ў ВНУ – гэта сапраўды прэстыжна, перспектыўна і цікава, а студэнцкае жыццё – проста фантастычны час!

13 лютага студэнты БДУ наведалі з добрааахвотнай акцыяй дзіцячы сад №1 г. Ліды для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні. Вясёлыя роставыя лялькі – леў Лёва і мядзведзь Таптыгін – падарылі дзецям не толькі горы падарункаў, але і мора ўсмешак, эмоцый, радасці, добрага настрою з песнямі пад баян і карагодам.

У сваю чаргу, студэнты-актывісты змаглі пазнаёміцца з гістарычнымі месцамі і мемарыяльнымі комплексамі Лідчыны, сабралі інфармацыю пра выпускнікоў БДУ, якія працуюць у Лідскім раёне.



Завяршылася акцыя 14 лютага гала-канцэртам у дзіцячай школе мастацтваў г. Ліды. У холе ўсе ахвотныя маглі атрымаць раздатачны матэрыял пра БДУ і яго факультэты, а таксама ўбачыць прэзентацыі са студэнцкіх мерапрыемстваў, паўдзельнічаць у конкурсе на найлепшую студэнцкую асацыяцыю, выпрабаваць лёс у LOVE-лато (у сувязі з Днём усіх закаханых) і нават станцаваць ленінградскі рок-н-рол на сцэне.

Вынікі анкетавання старшакласнікаў паказалі, што праект сапраўды быў карысны і цікавы. Шчаслівыя твары студэнтаў і школьнікаў сведчаць пра тое, што мост паміж сталічным студэнтствам і школьнікамі Лідчыны сапраўды збудаваны. Студэнты гуманітарнага факультэта нават звярнуліся да кіраўніцтва з прапановай адкрыць у Лідзе філіял БДУ, надта ўжо ім тут спадабалася!

Усё добрае калісьці заканчваецца. Пара вяртацца, каб праз год прыехаць у адзін з гарадоў нашай дзіўоснай краіны і падарыць такое ж свята іншым рэгіёнам!

P.S. Арганізатары выказваюць асаблівую падзяку кіраўніцтву універсітэта – за падтрымку ў рэалізацыі праекта, упраўленню па справах культуры БДУ – за правядзенне гала-канцэрта, а таксама лідскаму райвыканкаму і кіраўніцтву школ – за выдатны прыём.

**Юлія КРУК**
**Фота Лаліты КАЦЮРЫ**

СВЯТЫ

# ЗВЯРТАЕМСЯ ДА КАРАНЁЎ

***З нагоды Міжнароднага дня роднай мовы, заснаванага па ініцыятыве ЮНЕСКА, загадам рэктара БДУ 21 лютага быў аб'яўлены ва універсітэце Днём беларускай мовы і на ўсіх факультэтах былі праведзеныя разнастайныя мерапрыемствы.***

На філалагічным жа факультэце святкаванне расцягнулася на цэлы тыдзень. Яно распачалося 16 лютага літаратурна-музычнай імпрэзай з удзелам дырэктара Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, старшыні Міжнароднага камітэта славістаў прафесара Аляксандра Лукашанца і паэта Навума Гальпяровіча. 17 лютага, у Дзень беларускага слоўніка, адчыніла свае дзверы "Лінгвістычная гасцёўня", куды завіталі аўтары-складальнікі беларускіх слоўнікаў: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Вячаслаў Шчэрбін, кандыдат філалагічных навук Ігар Капылоў і іншыя навукоўцы. 18 лютага ў актавай зале факультэта прайшла пазнавальна-забаўляльная гульня "Філалогія і Я", у якой прынялі ўдзел студэнты І курса. 19 лютага быў прысвечаны навуцы, таму героямі сустрэчы са студэнтамі сталі вядомыя вучоныя-мовазнаўцы Аляксандр Крывіцкі, Арнольд Міхневіч, Ніна Мячкоўская, Сяргей Важнік і Алеся Доўгаль. Завяршыў тыдзень 20 лютага "Дзень беларускага перакладу" з удзелам выкладчыкаў філфака – прафесара Вячаслава Рагойшы, дацэнтаў Тацціяны Кабржыцкай, Ніны Рашэтнікавай, Міхася Кенькі, Ірыны Багдановіч.

**Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**



У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ

***Беларусь – адна з самых маляўнічых краін Еўропы. Наша прырода, архітэктура, культура і гісторыя захапляюць шматлікіх замежных гасцей. Але і нам, беларусам, карысна наведаць розныя куткі роднай зямлі, каб лішні раз зразумець, якія мы багатыя.***

Не чакаючы вясны, самыя дапытлівыя хлопцы і дзяўчаты Студэнцкага гарадка БДУ адправіліся даведацца, якія таямніцы, цікавыя легенды захоўваюць архітэктурныя помнікі Слонімшчыны.

Апякунскі Савет Студгарадка арганізаваў гэтую паездку для студэнцкага актыву і сацыяльна неабароненай катэгорыі студэнтаў у асаблівы дзень – 14 лютага, у Дзень закаханых. Студэнты, якія рызыкнулі правесці гэтае рамантычнае свята не так, як звычайна, не памыліліся. Іх чакала шмат дзівоснага.

Стомленасць ад доўгай дарогі ў Гродзенскую вобласць знікла адразу ж з першымі ўражаннямі ад чароўнага Слоніма. Свой след у гісторыі гэтага горада пакінулі самыя яркія прадстаўнікі такіх вядомых родаў, як Сапегі, Агінскія, Касцюшкі. Дарэчы, пры гетману вялікім літоўскім Міхаілу Казіміру Агінскім Слонім здабыў славу "Паўночных Афін". Мецэнат пабудаваў тут незвычайны тэатр, у якім за звычайнай сцэнай месцілася яшчэ адна ў выглядзе басейна – для інсцэнавання марскіх баталій.

У цэнтры Слоніма захаваліся рэшткі замчышча, першай гарадской пабудовы. Горад незвычайны і тым, што тут мірна суіснуюць усе асноўныя рэлігіі. Недалёка ад цэнтральнай плошчы можна знайсці праваслаўную царкву, каталіцкі касцёл, яўрэйскую сінагогу і мусульманскую мячэць. Гэтыя архітэктурныя помнікі створаныя ў 17-18 стагоддзях і некаторыя з іх так і не рэстаўраваліся, захавалі сляды цяжкай гісторыі горада і нашай краіны. У горадзе засталася старажытная планіроўка, тут вельмі мала сучасных будынкаў, і таму сам Слонім падаецца вялікім помнікам гісторыі.


*На тэрыторыі Жыровіцкага манастыра*

Жыровіцкі манастыр – яшчэ адно месца, якое наведалі студэнты. На тэрыторыі манастыра знаходзіцца духоўная семінарыя, дзе будучыя святары вывучаюць Біблію і іншую рэлігійную літаратуру. Малады семінарыст паказаў манастыр, правёў па будынку семінарыі, распавёў пра багатае гістарычнае мінулае Жыровічаў. Гэта месца славіцца сваёй цудатворнай іконай. Шмат гадоў назад мясцовыя пастухі ўбачылі ў полі яркае святло. Распавядаюць, што менавіта там з'явіўся вобраз Панны Марыі, а на камені, на якім яна стаяла, застаўся след – выбіты сілуэт жанчыны з немаўлём на руках. Частка каменя з малюнкам была перанесеная ў храм і зараз да гэтай іконы прыходзяць людзі, каб падзякаваць вышэйшым сілам або папрасіць здароўя і дабрабыту. А яшчэ непадалёк ад манастыра цячэ Святая крыніца. Некалькіх студэнтаў, не спалохаўшыся холаду, акунуліся ў ваду і парабавалі на сабе яе цудадзейную сілу.

Старажытная архітэктура, неверагодныя легенды, цікавыя аповеды экскурсаводаў папоўнілі скарбонку яркіх уражанняў. Такія паездкі лішні раз паказваюць, як беражліва трэба ставіцца да культурнай спадчыны нашай краіны, каб яшчэ доўгі час мець магчымасць дакрануцца да гісторыі.

**Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года
24 лютага 2009 года
Падпісана да друку 23.02.2009 г.
Зак. 179. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, каб. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by